Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.

Магчыма спадзявацца, што інфармацыйны рэсурс, які рыхтуецца ў Год малой радзімы ў Беларусі, для жыхароў Брэсцкага рэгёна і яго даследчыкаў стане важнай крыніцай пазнання гісторыі і культуры і новых адкрыццяў.

---

1. Градоўкіна, І.У. Праект «Віртуальная рэканструкцыя дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі» ў кантэксце стварэння крыніцазнаўчай базы па гісторыі айчыннай навукі і адукацыі / Градоўкіна І.У. // Материалы IV Международного конгресса ―Библиотека как феномен культуры". Информационные ресурсы библиотек в образовательной, научной и социокультурной среде, Минск, 4–6 октября 2016 г. / [сост. А.А. Суша ; науч. ред. Р.С. Мотульский]. – Минск, 2016. – С. 60–67.

2. Грядовкина, И. Мультимедийный проект «Памятные книжки Гродненской губернии» в помощь изучению истории Гродно и региона / Ирина Грядовкина // Бібліятэчны свет. – 2014. – № 2. – С. 19–21.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Вайцяхоўская А.Д.** студэнт
Навуковы кіраўнік – Гулак А. А.

## АКТУАЛІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА АРНАМЕНТА Ў СУЧАСНАЙ КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ

Значэнне, віды і мастацкая вобразнасць беларускага арнамента, яго ўжыванне ў народным тэкстылі і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве сёння грунтоўна даследаваны ў навуцы. Назавем толькі асноўныя працы ў гэтым кірунку: В.Я. Фадзеева «Беларуская народная вышыўка» (1991), М.П. Жабінская «Складзі ўзор сам» (1992), М.С. Кацар «Беларускі арнамент: Ткацтва. Вышыўка» (1996), Я.М. Сахута «Народнае мастацтва Беларусі» (1997),

С.А. Ганчарова «Геаметрыя беларускага арнаменту» (2003), В.А. Лабачэўская, З.І. Зіміна «Беларускі народны касцюм» (2009), Л.Я. Агеева «Асіметрычны элемент арнаменту віцебскага ручніка» (2017) і іншае.

Напачатку адзначым, што «арнамент (ад лац. ornamentum упрыгожанне), узор, які складаецца з рытмічна ўпарадкаваных элементаў для аздаблення твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, архітэктурных збудаванняў, прадметаў хатняга ўжытку» [4, с. 35]. Арнаменты ў культуры народаў свету надзвычай разнастайныя і ў розных этнасаў адны і тыя ж знакі тлумачацца па- рознаму. Як з'ява нашай нацыянальнай культуры арнамент таксама вельмі каштоўны і самабытны, яго значэнне сёння ўзрастае: «традыцыйнае мастацтва як спецыфічная праява светапогляду беларусаў дае яскравае ўяўленне пра этнічную аснову і характар развіцця культуры краіны» [3, с. 36]. Культура знаходзіцца ў цеснай і сталай сувязі з сучаснасцю, таму адбываецца працэс яе бесперапыннага абнаўлення. Але гэта аднаўленне можа адбывацца праз актуалізацыю традыцыйных каштоўнасцей, якія па пэўных прычынах страцілі ранейшую актуальнасць. Пераемнасць – вось асноўная якасць традыцыйнай нацыянальнай культуры, дзякуючы якой сюжэты або элементы арнаменту сёння робяцца запатрабаванымі.

Адзначым у агульных рысах, што даследчыкі Жабінская М.П., Кацар М.С. Фадзеева В.Я. сцвярджаюць, што да асноўных матываў беларускага арнаменту належаць геаметрычны, раслінны і тэраталагічны.

Сярод геаметрычных матываў сустракаюцца ромб, квадрат і прамавугольнік, зорка, крыж, трохвугольнік і інш. Геаметрычныя фігуры і матывы ўпрыгожвалі гліняныя вырабы першабытных людзей. Вучоныя мяркуюць, што прамой гарызантальная лініяй і трохвугольнікам нашы далёкія продкі абазначалі зямлю, хвалістай – ваду, крыжам – агонь. Пры вывучэнні народнага арнаменту важна высветліць, нараджэнню якіх арнаментальных формаў садзейнічала тэхналогія ткацтва, а якія маюць старадаўнюю знакавую сімволіку.

У раслінным арнаменце найчасцей можна сустрэць выяву валошкаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

званочкаў, кветак шыпшыны, стрэлак і іншых, радзей – каласоў пшаніцы, жыта, ягад рабіны, вінаграду. Раслінныя матывы – больш позняя з‘ява ў мастацтве арнаменту. Найперш за ўсё трэба прыняць пад увагу трансфармацыю геаметрычных формаў у раслінныя. Калі раскласці разетку на асобныя пялёсткі, то атрымаем касыя і прамыя элементы геаметрычнага арнаменту.

Тэраталагічны арнамент уключае ў сябе выяву вобразаў птушак (голуб, певень, курыца, паўлін, воран, арол, зязюля, гусь, качка). Багацце рэалістычных і фантастычных вобразаў таксама найцікавейшая тэма для даследавання.

Трэба адзначыць, што ў з 2010-х гадоў у нашым грамадстве назіраецца масавая цікавасць да гэтай з‘явы нацыянальнай культуры. У апошні час у інтэрнэце з‘явілася мноства сайтаў (symbal.by, lstr.by, vishivanka.by, honar.by, ethno.shop.by, belarusam.by і інш.), якія прапануюць шырокі выбар прадукцыі з традыцыйным беларускім арнаментам: адзенне, аксесуары, гадзіннікі, сувеніры, вокладкі, посуд, кнігі, дыскі і іншае. Напрыклад, да стагоддзя Беларускай Народнай Рэспублікі крама «Symbal.by» і «Арт Сядзіба» распрацавалі фірмовы стыль для адзначэння 100-годдзя БНР, а таксама серыю сувенірнай прадукцыі, якая ўжо шырока прадстаўлена.

Шматлікія беларускія брэнды рэкламуюць свой тавар з выкарыстаннем арнаменту. Да іх належаць прадпрыемства лёгкай прамысловасці: ААТ «8 Сакавіка» (Гомель), ТАА «Mark Formelle» (Заслаўль), ААТ «Купалінка» (Мінск), у якога ёсць цэлая прысвечаная тэме арнаменту калекцыя, пад назвай «Я люблю Беларусь».

За апошнія некалькі гадоў былі прапанаваны праекты па папулярызацыі беларускага арнаменту, аднак вялікая частка пакуль яшчэ не змагла знайсці іевстараў. Мануфактура «Mad Green Hand» Станіславам Нікановіча, створаная ў 2012 годзе, ставіць мэту стварэння ўнікальных падарункаў ручной працы з металу і іншых матэрыялаў з нацыянальным беларускім арнаментам у рамках праекта «Сківіца». Паступова папулярнасць пачынае набіраць такая з'ява як рэстайлінг легкавых машын беларускім арнаментам. Павялічваючы цікавасць да яе арт-студыя PRAS і вядомы беларускі дызайнер Уладзімір Цэслер таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прапануюць арыгінальныя рашэнні [2].

У апошні час стала модна рабіць татуіроўкі ў выглядзе арнаменту. Узор можна абраць абсалютна любы, у тым ліку той, што вы бачылі на бабуліным ручніку. Маладыя людзі робяць такія татуіроўкі ў асноўным для таго, каб падкрэсліць сваю прыналежнасць да беларускай культуры. Тут папулярнымі з‘яўляюцца сімвалы сям‘і, шчасця, ураджаю, працягу роду, сувязі з продкамі.

З 2016 года ў нашай краіне праводзіцца зусім яшчэ маладое свята: 2 ліпеня – Дзень беларускай вышыванкі. Традыцыя была распачата ў Год культуры. Дзень вышыванкі арганізавалі ў Мінску Міністэрства культуры Беларусі, сталічная мэрыя і Рэспубліканскі саюз моладзі (БДСМ). «Арнамент, які мы бачым, сыходзіць каранямі ў глыбокае мінулае, – заявіў міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей. – Нашы продкі насілі вопратку з такім арнаментам, адзначалі ў такой вопратцы сямейныя і нацыянальныя, дзяржаўныя святы. Гэты арнамент ніколі не адлюстроўваў нешта дрэннае – вайну, зло, гвалт. Ён прапаведаваў толькі дабро, спакой і мір. І гэта адлюстроўвае менталітэт нашага народа. Добра, што сёння мы маем магчымасць вярнуцца да сваёй гісторыі» [1].

Вялікую папулярнасць у кантэксце гэтага дня атрымалі стужкі з беларускім арнаментам. Акцыю з энтузіязмам падхапілі ў інтэрнэце, пачалі скупляць стужачкі ў крамах тканін і вешаць іх на адзенне, атрыбуты і іншае. Як бачым, правядзенне Дня вышыванкі напярэдадні Дня Рэспублікі можа стать добрай традыцыяй, мэта якой накіравана на папулярызацыю нацыянальнай культуры, умацаванне нашай нацыянальнай свядомасці праз захаванне злучальнай ніткі пакаленняў.

Вышыты нацыянальны арнамент – візітоўка нашай краіны і яе жыхароў. Гэта не проста ўпрыгожванне, а своеасаблівая этнічная аснова, якая праз стагоддзі дайшла да нас. Кожны ўзор у арнаменце – сімвал, які валодае магутнай энергетыкай, не выпадкова яшчэ здаўна гэтыя ўзоры лічыліся засцярогамі. Арнаменты сёння актыўна вывучаюцца навукоўцамі як найбагацейшая крыніца інфармацыі пра жыццё папярэдніх пакаленняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Дипломатия вышиванки. Как Макей и послы с семьями приоделись с национальным колоритом [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://news.tut.by/economics/548724.html. – Дата доступу: 5.02.2018.

2. На машинах, одежде и теле: как белорусская вышиванка из музейного экспоната превратилась в модный тренд [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.ctv.by/na-mashinah-tele-i-odezhde-kak-vyshivanka-iz-muzeynogo-eksponata-prevratilas-v-modnyy-trend.html. – Дата доступу: 5.02.2018.

3. Традыцыйны беларускі арнамент як крыніца інспірацыі ў творчасці сучасных дызайнераў / А.С. Бохан // Дзяржава і творчая асоба: матэрыялы V рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, 4 снежня 2014 г.). – Мн. : БДАКМ, 2014. – С. 35–39.

4. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.

**Валикаева Д.Е.,** студент

Научный руководитель - Мархоцкий Я.Л.

## ЭЛЕКТРОМАГНИТНЫЙ СМОГ И ЕГО ВЛИЯНИЕ НА ЖИЗНЕДЕЯТЕЛЬНОСТЬ

Интенсивное использование электромагнитной и электрической энергии в современном информационном обществе привело к тому, что в последней трети XX века возник и сформировался новый значимый фактор загрязнения окружающей среды – электромагнитный смог. Проблема электромагнитной безопасности и защиты окружающей природной среды от воздействия электромагнитного поля (ЭМП) приобрела большую актуальность и социальную значимость, в том числе на международном уровне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ